АХОВА

ПАД ЗНАКАМ САВЫ

№ 2 (6)

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„Дысцыпліна, вытрымка, вынослівасць у самых непрадказальных сітуацыях — вось тыя асноўныя якасці, якія неабходна выпрацаваць у сабе будучаму супрацоўніку міліцыі за кароткі перыяд навучання.“

„...мы вельмі шмат увагі надаём недапушчэнню пранікнення ў міліцэйскія шэрагі асобаў з нізкімі агульнаадукацыйным узроўнем і маральна-дзелавымі якасцямі.“

Віталь КАЗЛОЎСКІ, намеснік начальніка Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі:

«АД ЯКАСЦІ АДБОРУ І ВЫВУЧЭННЯ КАНДЫДАТАЎ НА СЛУЖБУ Ў ОРГАНЫ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ЗАЛЕЖЫЦЬ АЎТАРЫТЭТ СЛУЖБЫ Ў ЦЭЛЫМ»

— Віталь Іосіфавіч, вы згодныя са сцвярджэннем, што кадры вырашаюць усё?

— Бясспрэчна. Бо ад якасці адбору кандыдатаў на службу ў немалой ступені залежыць стан дысцыпліны і законнасці ў падраздзяленнях, стан маральна-псіхалагічнага клімату ў кожным калектыве. Напрыклад, летась упраўленнем кадраў Дэпартамента аховы і кадравымі падраздзяленнямі на месцах была праведзена значная работа па выкананні патрабаванняў кіраўніка дзяржавы, кіраўніцтва МУС Беларусі па ўдасканальванні дзейнасці органаў унутраных спраў, вывучэнні і падборы кандыдатаў на службу, якасным камплектаванні і навучанні асабовага складу. Значнай падзеяй для нас стала таксама зняцце з Дэпартамента аховы ліміту колькасці, што дазволіла ўкамплектаваць падраздзяленні па меры неабходнасці дадатковымі людзьмі. Бо дэпартамент нарошчвае абароты службовай дзейнасці, тэхнічна ўдасканальваецца, расце колькасць аб'ектаў і кватэр, якія патрабуюць кваліфікаванай аховы, а значыць, расце і неабходнасць увядзення новых працоўных месцаў у падраздзяленнях.

Фота А. ЯРМАЛІНСКАЙ

— Віталь Іосіфавіч, раскажыце крыху пра «працэдуру» камплектавання падраздзяленняў аховы?

— У мэтах камплектавання пасад грамадзянамі, здольнымі па сваіх асабістых, маральных і дзелавых якасцях выконваць задачы, ускладзеныя на органы ўнутраных спраў, у мінулым годзе праводзілася мэтанакіраваная агітацыйна-растлумачальная работа ў вайсковых часцях Узброеных Сілаў, унутраных войсках МУС, установах адукацыі. Ажыццяўлялася цеснае ўзаемадзеянне з раённымі ваеннымі камісарыятамі па пытанні адбору і накіравання на службу ў органы ўнутраных спраў асобаў, звольненых з ваеннай службы ў запас. Вялася таксама актыўная работа ў сродках масавай інфармацыі і тэрытарыяльных службах занятасці.

Летась мы прынялі на службу больш як 835 чалавек.

— А як вызначаецца, ці падыходзіць той або іншы кандыдат на службу?

— Па-першае, мы вельмі шмат увагі надаём недапушчэнню пранікнення ў міліцэйскія шэрагі асобаў з нізкімі агульнаадукацыйным узроўнем і маральна-дзелавымі якасцямі. Па-другое, каб выявіць індывідуальныя здольнасці асобы, інтэлектуальнае развіццё будучых супрацоўнікаў, паспяхова выкарыстоўваецца сістэма тэсціравання і прафесійна-псіхалагічнага адбору.

— А ці шмат кандыдатаў на службу ў органы ўнутраных спраў?

— У выніку праведзеных мерапрыемстваў праз кадравыя падраздзяленні Дэпартамента аховы ў 2009 годзе прайшло больш як 4000 маладых людзей. На розных стадыях вывучэння камплектуючымі органамі было адмоўлена ў прыняцці на службу 2739 асобам па стане здароўя, у сувязі з нізкімі маральнымі і дзелавымі якасцямі.

— Якая дапамога аказваецца курсантам, якія праходзяць першапачатковую падрыхтоўку ў Вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы?

— У падраздзяленнях дэпартамента ў 2008—2009 гг. рэалізаваная праграма па арганізацыі і правядзенні псіхалагічнай і выхаваўчай работы па ўмацаванні прафесійнай матывацыі курсантаў першапачатковай падрыхтоўкі і супрацоўнікаў са стажам службы да аднаго года. Гэта праграма дазваляе, з аднаго боку, адэкватна ацаніць кандыдату свае магчымасці да новай прафесійнай дзейнасці, а з іншага — кіраўніцтву вызначыць здольнасці кандыдата да меркаванай пасады, выявіць сапраўдныя матывы паступлення на службу, спыніць пранікненне ў ОУС злачынных элементаў.

— Віталь Іосіфавіч, вы як кіраўнік кадравага апарату Дэпартамента аховы, чым можаце ганарыцца?

— Сёння мы смела можам ганарыцца ўзроўнем прафесійнай і фізічнай падрыхтоўкі супрацоўнікаў аховы. Нядаўна супрацоўнікі дэпартамента заваявалі «золата» на чэмпіянаце МУС па лыжных гонках, мы пастаянна займаем прызавыя месцы на рэспубліканскіх, а таксама еўрапейскіх турнірах па міні-футболе, самба, лёгкай атлетыцы. У нашых падраздзяленнях служаць супрацоўнікі, якія з'яўляюцца прызёрамі Алімпійскіх гульняў і іншых значных спартыўных спаборніцтваў у сусветным маштабе. А ўвогуле, мы правамерна можам ганарыцца ўсім сваім калектывам, бо ў нас працуюць высакародныя, адданыя сваёй справе супрацоўнікі, гатовыя заўсёды прыйсці на дапамогу кожнаму грамадзяніну.

АДТОЧВАЮЧЫ ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Вучэбна-метадычны семінар па пытаннях арганізацыі ідэалагічнай работы і службовай падрыхтоўкі падраздзяленняў аховы Магілёўскай вобласці сабраў у абласным цэнтры больш як 50 супрацоўнікаў, адказных за гэтыя кірункі работы. Сход адкрыў палкоўнік міліцыі Сяргей Каралеў, які ўзначальвае аддзел ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў Магілёўскага аблупраўлення Дэпартамента аховы. У прывітальным слове да ўдзельнікаў ён адзначыў: «Наша прафесія патрабуе мужнасці, стойкасці, вытрымкі, кемлівасці, прафесійнага майстэрства, глыбокіх ведаў і высокай культуры. Дзе б вы ні былі, заўсёды памятайце, што ахоўваеце мірную працу народа Беларусі, законы нашай дзяржавы. Сёння неабходна якасна і добрасумленна вырашаць ускладзеныя на нас задачы. Менавіта нам варта рашуча і настойліва, у адпаведнасці з законам, спыняць злачынныя з'явы і парушэнні грамадскага парадку. І ў кожным канкрэтным выпадку, у кожнай сітуацыі трэба шанаваць давер людзей, якія даверылі нам самае дарагое — сваё жыццё».

У асноўнай частцы службовае мерапрыемства было прысвечана абмену вопытам работы, сярод спрактыкаваных афіцэраў і маладых спецыялістаў. Вялікае значэнне было нададзена дыскусійнаму разгляду пытання, звязаных з захаваннем законнасці і дысцыпліны, пытанням планавання выхаваўчай работы ў рэгіянальных падраздзяленнях, практычным заняткам па актуальных кірунках службовай дзейнасці.

На практычных занятках лепшыя супрацоўнікі падраздзяленняў прадэманстравалі сваё майстэрства і веды па доглядзе і захаванні табельнай зброі, навыкі па абыходжанні з ёю.

У падагульняльнай частцы семінара ўдзельнікі наведалі гісторыка-экспазіцыйную залу Магілёўскага абласнога ўпраўлення і былі прыемна здзіўленыя тым, што экспазіцыя цалкам адноўленая. З'явіўся і новы стэнд, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і будучаму юбілею Вялікай Перамогі.

ЦЯГА ДА КУРЭННЯ?

Каля 2 гадзін ночы ад дзяжурнага Бабруйскага УУС па радыёсувязі паступіла інфармацыя пра тое, што ў кавярню «У Фёдара» праніклі невядомыя. На месца здарэння адначасова прыбылі дзве групы затрымання Бабруйскага аддзела Дэпартамента аховы ў складзе прапаршчыкаў міліцыі Андрэя Ешчыка і Андрэя Роскача, старшыны міліцыі Дзмітрыя Дарды і старшага сяржанта Аляксандра Ігумнова.

Нарады размеркаваліся: адзін прыняўся абследаваць будынак, а другі — прылеглую тэрыторыю. Падчас агляду кавярні адзін з міліцыянераў заўважыў, што невядомы спрабуе выкараскацца праз акно падсобнага памяшкання. Падазронага тут жа «сустрэлі» праваахоўнікі. У гэты ж час другой групай затрымання быў заспеты хаўруснік, які спрабаваў схавацца недалёка ад кавярні.

Пры асабістым аглядзе падазроных міліцыянеры канфіскавалі ў іх каробку з 25 блокамі цыгарэт.

Гэты крадзеж, хоць і не адбыўся, быў ужо не першым на рахунку ва ўстановы. Аднак гаспадарнікі, у мэтах эканоміі грашовых сродкаў, грэбавалі прапановамі.

РЭАЛЬНЫЯ БУДНІ АХОВЫ

Міхаіл САМУСЕЎ, начальнік кадравага апарату Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі:

«ЦЯЖКІЯ БУДНІ ПАЗБАЎЛЕНЫ РАМАНТЫКІ, АЛЕ ГЭТА НЕ АДПУЖВАЕ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН...»

Па выніках службовай дзейнасці Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, у 2009 годзе Магілёўскае абласное ўпраўленне выйшла ў лідары па цэлым шэрагу пазіцый. У тым ліку і па арганізацыі кадравай работы. Сёння мы прапануем чытачам інтэрв'ю з начальнікам кадравага апарату абласнога ўпраўлення палкоўнікам міліцыі Міхаілам Самусевым.

— Магілёўскае абласное ўпраўленне Дэпартамента аховы больш як 57 гадоў ажыццяўляе ахову аб'ектаў і памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян. Аднак, кажучы пра поспехі рэгіянальных падраздзяленняў аховы ў цэлым, не лішнім будзе ўспомніць пра тых, хто адказвае за падбор і падрыхтоўку асабовага складу да нясення няпростай службы. Вы згодныя са мной, Міхаіл Іванавіч?

— Так, менавіта ад прафесіяналізму, узроўню падрыхтоўкі асабовага складу залежыць бяспека і захаванасць маёмасці грамадзян. У Магілёўскім абласным упраўленні дэпартамента працуюць 98,4 % супрацоўнікаў ва ўзросце 25—45 гадоў, якія маюць жыццёвы вопыт і практычныя навыкі нясення службы. Разам з тым, штогод па вобласці мы набіраем 60—80 чалавек з ліку грамадзянскай моладзі для нясення службы. Для таго каб пачаць выконваць службовыя абавязкі, кандыдатам трэба прайсці першапачатковую падрыхтоўку ў вучэбным цэнтры Дэпартамента аховы, атрымаць навыкі адміністрацыйнага, крымінальнага права, прафесійнай этыкі, агнявой падрыхтоўкі, самаабароны без зброі. Дысцыпліна, вытрымка, вынослівасць у самых непрадказальных сітуацыях — вось тыя асноўныя якасці, якія неабходна выпрацаваць у сабе будучаму супрацоўніку міліцыі за кароткі перыяд навучання. Цяжкія будні пазбаўлены рамантыкі, але гэта не адпужвае хлопцаў, якія кожны год спяшаюцца ўліцца ў шэрагі нашага асабовага складу. І гэта нягледзячы на тое, што толькі 1 з 5 кандыдатаў можа прайсці ўрачэбна-медыцынскую камісію і атрымаць шанц навучацца ў вучэбным цэнтры.

— Супрацоўнікі аховы штохвілінна павінны быць гатовыя да любых нечаканасцяў?

Фота А. САЛЯНЮК

— Вы маеце рацыю, спецыфіка дзеяння нарадаў аховы шмат у чым адрозніваецца ад дзеянняў іншых супрацоўнікаў міліцыі. Калі вы калі-небудзь звярталі ўвагу, як выязджае група затрымання на «спрацаваўшы» аб'ект, то абавязкова заўважылі, што ўсе міліцыянеры знаходзяцца ў поўнай баявой гатоўнасці: у касках, бронекамізэльках, са зброяй у руках. Падстрахоўваючы адзін аднаго, яны заўсёды гатовыя выканаць сваё баявое прызначэнне — затрымаць злачынцу або правапарушальніка, які нярэдка таксама ўзброены.

— Пэўна, самаадданыя дзеянні шараговых міліцыянераў не застаюцца без увагі кіраўніцтва?

— Ініцыятыўныя супрацоўнікі, якія добрасумленна выконваюць свой службовы абавязак і імкнуцца да ўдасканалвання сваіх прафесійных навыкаў, атрымліваюць магчымасць вылучэння на вышэйшыя пасады, становяцца афіцэрамі. Мэта, вартая ўпартай работы!

Першапачаткова гэта, як правіла, пасады камандзіраў узводаў. На іх мы прызначаем толькі тых супрацоўнікаў, якія папрацавалі на пасадах малодшага начскладу, ведаюць усю спецыфіку работы, атрымалі юрыдычную адукацыю і па сваім складзе характару могуць кіраваць падначаленымі. Толькі за апошнія два гады ў нас з ліку малодшага начскладу прызначана 8 камандзіраў узводаў. Хачу адзначыць з лепшага боку работу старшых лейтэнантаў міліцыі Аляксея Ганчарова і Вячаслава Капорыкава, якія за кароткі тэрмін сталі сапраўднымі афіцэрамі і добрымі кіраўнікамі.

У сваю чаргу кіраўніцтвам упраўлення робіцца ўсё магчымае для вырашэння сацыяльна-бытавых і, галоўнае, жыллёвых праблем нашых супрацоўнікаў. У 2010 годзе будзе здадзены ў эксплуатацыю новы жылы дом, пабудаваны з дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе льготнага крэдытавання, у якім набудуць уласнае доўгачаканае жыллё 46 супрацоўнікаў падраздзяленняў аховы Магілёва. Цяпер праводзяцца арганізацыйныя мерапрыемствы па стварэнні яшчэ аднаго ЖБК на 80 кватэр.

— Наколькі інфармаванае насельніцтва аб дзейнасці вашых падраздзяленняў, і як гэта адбіваецца на камплектаванні службы?

— Большая частка насельніцтва ведае пра нашу дзейнасць не па чутках. Няправільна здалі кватэру пад ахову — і на свае вочы пераканалая, праз які перыяд часу прыбывае нарад, у якой экіпіроўцы, як рэагуе на здарэнне. Дзеянне нарадаў груп затрымання па спыненні правапарушэнняў адбываецца, як правіла, на вуліцах гарадоў, на вачах у грамадзян. Усё гэта фарміруе аўтарытэт нашых супрацоўнікаў і ў цэлым дэпартамента, і няма неабходнасці тлумачыць патэнцыйным кандыдатам на службу патрабаванні, што прад'яўляюцца да супрацоўнікаў аховы. Многія грамадзяне даведваюцца аб службе аховы, непасрэдна кантактуючы з яе прадстаўнікамі. Прычым гэта і законапаслухмяныя грамадзяне, якія звяртаюцца па дапамогу, і тыя, хто ўчыняе правапарушэнні. Акрамя гэтага, мы жывём у век рэкламы і інфармацыі. Людзі даведваюцца пра нас не толькі па матэрыялах у сродках масавай інфармацыі, але і карыстаючыся інтэрнэтам.

— Як кажуць, «не службай адзінай...». Што вы можаце сказаць наконт гэтага?

— Вялікая ўвага надаецца арганізацыі паўнавартаснага і змястоўнага баўлення вольнага часу супрацоўнікаў, стварэнню ў калектывах спрыяльнай маральна-псіхалагічнай атмасферы. Штогод праводзяцца агляды-конкурсы мастацкай самадзейнасці, народнай творчасці сярод супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў, спартыўныя мерапрыемствы.

Супрацоўнікі падраздзяленняў аховы Магілёўшчыны дабіліся высокіх вынікаў у спорце — гэта майстры спорту Алег Гутнік, Сяргей Лось, Дзмітрый Сіваў, Аляксандр Басарыя, Руслан Шалаеў і Аляксей Кашаедаў.

Не забытыя ў падраздзяленнях аховы службовыя і баявыя традыцыі, на якіх выхаваны ўжо некалькі пакаленняў супрацоўнікаў. Багаты жыццёвы вопыт ветэранаў Магілёўшчыны запатрабаваны ў выхаваўчай рабоце. Па праве старэйшых таварышаў яны выступаюць сёння ў ролі настаўнікаў і шэфаў. Гэта Васіль Прохаравіч Яшкоў — былы начальнік абласнога ўпраўлення, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, Аляксандр Іванавіч Дзяткоў — старшыня Савета ветэранаў абласнога ўпраўлення і іншыя.

Шматлікі калектыў падраздзяленняў аховы Магілёўшчыны з годнасцю выконвае свой службовы абавязак, паколькі людзі, якія працуюць у ім, — сапраўдныя прафесіяналы, гатовыя выканаць усе пастаўленыя перад імі задачы.

Службовы прафесіяналізм, высокі ўзровень фізічнай падрыхтоўкі, актыўная жыццёвая і грамадзянская пазіцыя — вось збіральны вобраз сучаснага супрацоўніка. А шматлікія ўзнагароды і прызавыя месцы на чэмпіянатах Дэпартамента аховы і на рознага роду конкурсах гавораць самі за сябе. Бо, як адзначае Міхаіл Самусеў, гэтыя людзі даказваюць, што «Ахова» — не проста гучнае слова, а прызванне, карпатлівая штодзённая праца, паколькі прафесіяналізм складаецца з многіх асабістых якасцяў, якім часта нідзе нельга навучыць.

ВЕДАЙ НАШЫХ

У першай палове лютага ў Віцебску прайшоў чэмпіянат Дэпартамента аховы МУС Беларусі па рукапашным баі. У спаборніцтвах узялі ўдзел 49 удзельнікаў з сямі зборных камандаў усіх абласных і Мінскага гарадскога ўпраўлення дэпартамента. Выдатна, што сёлета, акрамя вопытных спартсменаў, а гэта шэсць майстроў спорту па рукапашным баі, у турніры ўдзельнічалі маладыя супрацоўнікі. Хлопцы выступалі ўпершыню, аднак паказалі дастаткова высокія вынікі. Да слова, усе прадстаўнікі гэтага віду спорту — дзейныя супрацоўнікі страявых падраздзяленняў аховы.

У розных вагавых катэгорыях месцы размеркаваліся наступным чынам: у вагавой катэгорыі 65 кг «золата» выйграў прадстаўнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення Сямён Тырля, ён жа атрымаў прыз «За лепшую тэхніку»; у вагавой катэгорыі 70 кг першае месца заняў Аляксандр Апаневіч — прадстаўнік Віцебскага абласнога ўпраўлення; лепшым у вагавой катэгорыі 75 кг стаў Артур Баярчук — супрацоўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення. Цікавым і захапляльным стаў паядынак паміж брастаўчанінам Анатолем Сафановічам, майстрам спорту па каратэ, і віцябчанінам Аляксандрам Свіціным, майстрам спорту міжнароднага класа па кікбоксінгу (85 кг). Ва ўпартай, практычна роўнай барацьбе, перамогу ўсе ж атрымаў Сафановіч.

У агульным камандным заліку залатым прызёрам стала каманда Віцебскага, сярэбраным — каманда Брэсцкага, а бронзавым — Гродзенскага абласных упраўленняў.

Фота Н. ЛЕРНАТОВІЧ

Каманда пераможцаў са сваімі кіраўнікамі.

«БАРАБАШКА» З КЛЮЧАМІ АД КВАТЭРЫ

Міліцыянер-кінолаг Дзяніс ТАРАСЕВІЧ і міліцыянер-вадзіцель Ігар САЦЭВІЧ.

Калі ў няпоўнагадовага сына жыхаркі г. Высокае Камянецкага раёна ў перыяд навагодніх святаў зніклі ключы ад дома, яна і ўявіць не магла, што гэта непрыемнасць пакладзе пачатак сістэматычнаму знікненню каштоўных рэчаў з кватэры. Спачатку прапажы не насілі сур'ёзнага характару. Жартуючы, гаспадыня кватэры нават спісвала ўсю віну на «барабашку», але больш дакарала сябе за няўважлівасць.

Неяк, адпраўляючыся на працу, жанчыне не давала спакою прадчуванне: штосьці абавязкова здарыцца. Яна ўсё ж адправілася на службу, аднак высеадзець да канца працоўнага дня так і не змагла. Падымаючыся па лесвіцы свайго пад'езда, змучаная ўсялякімі непрыемнымі думкамі, яна ўбачыла, як невядомы падлетак зачыняе дзверы яе кватэры.

Нарад групы затрымання Камянецкага аддзела аховы ў складзе міліцыянера-кінолага прапаршчыка Дзяніса Тарасевіча і міліцыянера-вадзіцеля сяржанта Ігара Сацэвіча ў гэты момант высвятляў абставіны выкрадання аўтамагнітолы з машыны ў суседнім двары. Тут да іх падбег мужчына і паведаміў, што ў адным з дамоў прама цяпер учыняецца крадзеж.

Затрымаць васьмікласніка добра падрыхтаваным мужчынам не склала асаблівай цяжкасці. Карыстаючыся раней выкрадзеным ключом, зладзюжка без цяжкасці пранік у «шматпакутную» кватэру. У гэты раз ён «прыбраў да рук» 1475 долараў ЗША, 1300 еўра, парфуму і спіртныя напоі.

НАД СПЕЦВЫПУСКАМ ПРАЦАВАЛІ:
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Аляксандр ГЕРАСІМАЎ,
Юлія АКСЮЧЫЦ,
Алена ЯРМАЛІНСКАЯ,
Аксана САЛЯНЮК,
Яўген КУЛЯГІН,
Вольга КІПЧАНКА.

АДЗІН ДЗЕНЬ ГРУПЫ ЗАТРЫМАННЯ

Са жніўня па снежань 2009 года Дэпартамент аховы сярод сваіх абласных і раённых падраздзяленняў правёў акцыю «Даражу службай у ахове» на лепшую публікацыю, тэле- і радыёсюжэт у сродках масавай інфармацыі. Супрацоўнікі паставіліся да гэтага з усёй адказнасцю. На працягу пяці месяцаў на конкурс прыйшло некалькі соцень матэрыялаў.

Адным з тых, што перамаглі, стаў артыкул, напісаны міліцыянерам групы затрымання Магілёўскага абласнога ўпраўлення, сумесна з журналістам адной з раённых газет.

Будні міліцыянераў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь непрадказальныя. Знаходзячыся пастаянна напагатове, яны гатовыя прыбыць да месца спрацоўвання трывожнай сігналізацыі ў лічаныя хвіліны. І што чакае іх у, здавалася б, самы звычайны працоўны дзень, невядома. Нават ім самім. Пра адзін дзень свайго дзяжурства расказаў Сяргей Рудзянкоў, міліцыянер групы затрымання Касцюковіцкага аддзялення аховы.

7.00. Пачынаецца працоўны дзень. Перш-наперш прыехалі ў РАУС, каб атрымаць табельную зброю для заступлення на службу. Давядзенне аператыўнага становішча ў горадзе за бягучыя суткі ў аддзеле ўнутраных спраў — працэдура традыцыйная. Прычым не толькі з намі, але і з іншымі службамі. Раз'язджаемся кожны па сваіх месцах. Наша група едзе ў аддзяленне аховы, дзе з намі праводзіць інструктаж адказны ў гэты дзень афіцэр. Хто ведае, можа, менавіта ў гэты дзень з намі адбудзецца менавіта такая сітуацыя? Кожнае дзяжурства непрадказальнае...

8.00. Прыступілі да нясення службы. Працуем строга па графіку, які распісаны па хвілінах. Маршрут руху пралягае толькі ў межах горада. За межы Касцюковічаў мы не маем права выехаць. Чаму? Уся сутнасць у тым, што зона дыслакацыі разлічаная такім чынам, каб у выпадку спрацоўвання кнопкі трывожнай сігналізацыі мы змаглі прыбыць да месца ў самы кароткі тэрмін. Бо нарматыўна-прававымі актамі вызначаныя часовыя рамкі прыбыцця. Максімум — 7 хвілін. Але мы звычайна спраўляемся раней.

8.20. Пачынаем патруляванне. Усё ціха. Нічога і ніхто не прыцягвае нашай увагі.

13.00. Знаходзімся на вуліцы Камсамольскай. Па рацыі паступае першае паведамленне. Дзяжурная пульта кіравання дакладвае аб спрацоўванні трывожнай кнопкі ў краме № 11. Людзі яе называюць «шляной». Спыніліся каля міні-рынку на Моладзевым. Трэба аператыўна экіпіравацца: бронекамізэлька, шлем. На гэту «працэдуру» звычайна ідзе секундаў 20. Без гэтага ніяк, трэба засцерагчы сябе. Прыбылі хутка, балазе, знаходзіліся недалёка.

Бягу і думаю, трывожную кнопку, як правіла, проста так не націскаюць. Альбо штосьці ўкралі, альбо хтосьці распачаў бойку. Страхуем адзін аднаго. Усялякае можа быць. На гэты раз усё тыпова: падазроны, людзі, якія сабраліся вакол яго. Мы нікога не выпускаем з крамы, каб зламыснік не ўцёк. Прадавец паказвае на мужчыну, на выгляд прыстойна апранутага, з вялікай сумкай у руках. Далей усё як звычайна: апытанне сведак, устанаўленне асобы падазронага. Бываюць і такія, якія не заўсёды пагаджаюцца з абвінавачаннем, наладжваюць скандалы на публіку. Гэты «зламаўся» хутка, прызнаў сваю віну. Па-іншаму і быць не можа, доказы відавочныя: з яго сумкі прадавец дастала пакет малака і мясную прадукцыю на суму каля 35 тысяч рублёў. Наша місія ў гэтай справе заканчваецца. Саджуся ў машыну, званю дзяжурнаму пульта кіравання. Цікаўлюся часам прыбыцця да аб'екта, на якім спрацавала кнопка. На гэты раз 1 хвіліна 50 секундаў. Добры вынік!

13.35. Ці будзе сёння яшчэ «спрацоўванне», невядома. Наша задача — заўсёды быць напагатове. Ад РАУС вярнуліся на свой маршрут. Дзень сёння будні, у горадзе ціха. У выхадныя сітуацыя можа карэнным чынам памяняцца, асабліва вечарам, калі моладзь выходзіць адпачыць.

18.00. Нас выклікае па радыёстанцыі дзяжурны РАУС, просіць праехаць да гастранома № 1, каля кавярні «Чайка»:

— Бойка. Акажыце дапамогу патрульна-паставому нараду.

— Вас зразумеў. Выязджаем... — паведамляю па рацыі.

Едзем да месца бойкі. Зноў хтосьці штосьці не падзяліў. У натоўпе заўважаем патруль, які спрабуе ўціхамірыць добра падпіўшых мужчын. Парушальнікаў спакою — чатыры. Убачыўшы нас пры поўнай экіпіроўцы, яны рэціраваліся. Часта так бывае — калі людзі бачаць нас у бронекамізэльках і са зброяй у руках — палохаюцца. А тым часам прыехаў на дапамогу і экіпаж ДАІ. Аднаго з парушальнікаў парадку нам давялося затрымаць.

19.00. Да канца нашай змены надвор'е пагоршылася. Насоўваліся навальнічныя хмары. З практыкі ведаю, калі пачынаецца навальніца, работа напарадзе напружаная. Як правіла, з-за навальніцы можа быць пашкоджана ахоўная сігналізацыя на некалькіх аб'ектах. Так яно і атрымалася. Але, хачу адзначыць, нават пры адключэнні электрычнасці наша ахоўная сігналізацыі «сілкуецца» ад рэзервовых крыніц сілкавання.

У гэты вечар за паўгадзіны спрацавалі чатыры аб'екты. Па вялікім рахунку, дробязь. Бывае і больш. Аднойчы, памятаю, пры штармавым ветры спрацавала 20 аб'ектаў! Тады ўжо дакладна давялося «папацець»... Быў падняты ўвесь асабовы склад па трывозе, і на працягу 30 хвілін усе аб'екты былі забяспечаны аховай. У такіх выпадках часам даводзіцца прасіць дапамогі ў РАУС, але сёння справімся самастойна. Добра, што аб'екты спрацавалі не ў адзін час, таму да кожнага з іх паспелі ў самыя кароткія тэрміны. На апошні прыбылі за 4 хвіліны. Выдатна...

20.00. Нас мяняе іншы нарад. Пытанні наконт дзяжурства, здача змены адказнаму, даклад аб падзеях за дзень. Едзем у РАУС, здаём зброю. Змена закончылася. Стаміўся. Дзень выдаўся напружаным. У наступны раз заступаю ў ноч. Іду адсыпацца...